# Выбары ў люстэрку права

**Выстава пад такой назвай працуе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Экспазіцыя, якая адкрылася 5 лютага ў галоўнай кніжнай скарбніцы краіны, прымеркавана да адзінага дня галасавання: 25 лютага будуць выбраны 110 дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 8-га склікання і 12 514 дэпутатаў мясцовых Саветаў 29-га склікання.

На выставе ў Нацыянальнай бібліятэцы прадстаўлена каля 70 дакументаў на беларускай і рускай мовах. Гэта нарматыўна-прававыя акты, каментарыі, манаграфіі, зборнікі артыкулаў і тэзісаў, матэрыялы дакладаў і навукова-практычных канферэнцый, аналітычных аглядаў, семінараў і круглых сталоў.

Экспазіцыя ўключае чатыры раздзелы — “Канстытуцыя як аснова выбарчага права Рэспублікі Беларусь”, “Выбары: прававыя асновы і выбарчыя тэхналогіі”, “Выбарчы працэс Беларусі: этапы развіцця і сучаснасць”, “Парушэнні нормаў выбарчага права: адказнасць і прававая абарона”.



Азнаёміцца з тэматычнымі матэрыяламі можна да 1 сакавіка.